ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 231 (1198) | НЯДЗЕЛЯ, 5-га кастрычніка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.



Дні баявой падрыхтоўкі да зьезду запоўнім НОВЫМ МАГУТНЫМ ШКВАЛАМ комсамольскай ініцыятывы

ПАД ЗНАКАМ ВЫКАНАНЬНЯ БАЯВЫХ ЗАДАЧ

Праз паўтара месяцы—усебеларускі зьезд комсамолу. Праз два тыдні пачнуцца раённыя конфэрэнцыі комсамолу. Перавыбары саюзных органаў маюць для комсамолу агромністае палітычнае значэньне. Перавыбары—гэта ня толькі перамена кіраўніцтва, і нават ня стольі перамена кіраўніцтва, асьвяжэньне яго і г. д.

Задача перавыбарнай кампаніі заключаецца ў тым, каб на аснове вывучэньня пройдзенага этапу, карыстаючыся мэтадам самакрытыкі, даць аналіз сучаснага стану комсамолу, адшукаць прычыны тых або іншых дрэнных зьявішчаў, адшукаць такія мэтады работы, якія-б адпавядалі цяперашнім абставінам і прыялі-б яшчэ большай мобілізацыі мас комсамольцаў на выкананьне пастаўленых партыяй задач.

Падрыхтоўка да зьезду, самы зьезд і раённыя конфэрэнцыі будуць праходзіць ва ўмовах, калі, дзякуючы пасьпяховаму ў асноўным правядзеньню ўборкі ўраджаю і ходу асеньняй сяўбы, бядняцка-серадняцкія масы на практыцы пераканаліся ў правільнасьці курсу партыі на колектывізацыю вёскі, аб чым сьведчыць новы прыліў у колгасы.

Партыя кінула лёзунг арганізацыі сустрэчы новага колгасьніка, патрабавала ўзмацненьня тэмпу работы па колектывізацыі, злучыўшы за справе правядзеньне гаспадарчых кампаній — асеньняй сяўбы, хлеба і бульбазагатовак з арганізацыяй прыліву стварэньня новых колгасаў.

З другога боку, зьезд будзе праходзіць тады, калі сама рабочая кляса, шляхам арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну, выставіла патрабаваньні яшчэ большага ўзмацненьня тэмпаў выкананьня пяцігодкі.

Усё гэта, безумоўна, высоўвае асноўныя лёзунгі падрыхтоўкі да зьезду: сустрэчу новага колгасьніка ўзмацненьне работы па колектывізацыі, пасьпяховае правядзеньне загатовак і скончэньне асеньняй сяўбы, паскарэньне тэмпаў работ прадпрыемстваў, перарастаньне соцспаборніцтва на вышэйшую ступень.

Барацьба з кулаком і яго падгалоскамі—важнейшая задача

Узмацненьне тэмпаў соцыялістычнай будоўлі выклікае на сёньнешні дзень яшчэ большае супраціўленьне клясава-варожых элемэнтаў,—кулака і нэпмана. Цяжкасьці пераживаемага пэрыоду даюць повад для бурчаньня розным дробна-буржуазным элемэнтам. Уплыву дробнай буржуазіі і кулацтва паддаюцца і паасобныя члены партыі. Таму, побач з праяўленьнем максымальнай энэргіі на выкананьне гаспадарчых задач, адной з асноўных задач павінна быць барацьба з кулаком, барацьба з кулацкімі і дробна-буржуазнымі падгалоскамі ў партыі і комсамоле, у якую-б скуру яны ні апраналіся. Ці то ў форме правага опортунізму, па якому патрэбна накіроўваць галоўны агонь, ці ў форме левых загібаў троцкісцкага спосабу.

ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове аб становішчы беларускага комсамолу ўказаў, што для беларускага комсамолу характэрна адставаньне тэмпаў работы і кіраўніцтва ад тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва.

Пасьля рашэньня прашло ўжо каля году. За гэты час комсамолам Беларусі праведзена немалая работа.

Аднак, трэба сказаць, **што тэмпы работы комсамолу яшчэ надзвычайна нізкія.** Ход колгаснага вытворчага паходу, сустрэча новага гаспадарчага году, побач з безумоўнай наяўнасьцю прыкладаў бальшавіцкай работы, усё-ж выяўляюць незадавальняючасьць тэмпаў работы. А ў шэрагу арганізацый тэмпы настолькі нізкія, што вядуць арганізацыю да скату ў атрады тых, якія цягнуцца ў хвасьце падзей.

Вышэй тэмпы работы

Комсамол Беларусі ўзяў на сябе абавязак **даставіць сьвінаводчую эстафэту IX зьезду УсеЛКСМ.** Комсамол заключыў дагавор з гаспадарчымі органамі Наркомасьветы за пасьпяховае правядзеньне політэхнізацыі школ, **мы абавязаліся адправіць сіламі комсамольцаў 10 эшалёнаў бульбы пролетарскай Маскве.**

Узяўшы на сябе гэтыя абавязкі перад тварам усяго Саюзу мы выкінулі лёзунг: **увесь комсамол—ударная брыгада.** Гэты ленінскі лёзунг абавязвае кожнага комсамольца стаць сапраўдным ударнікам.

З усяго гэтага вынікае, што асноўнае зараз—**тэмпы.** Таму падрыхтоўка к зьезду павінна праходзіць пад лёзунгам барацьбы **за бальшавіцкія высокія тэмпы ў рабоце,**—за пасьпяховае і хуткае выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў, як у горадзе, так і на вёсцы.

Быць організатарамі мас

Правядзеньне ўборкі ўраджаю, асеньня-пасеўнай кампаніі, сілосаваньня і г. д. гаворыць у асноўным за тое, што комсамолам праведзена вялікая работа. Але, калі прыглядзецца бліжэй да месца якое ва ўсёй гэтай працы займае вясковая комсамольская ячэйка, дык прыходзіцца зрабіць вывад, што яе ўдзельная вага ў соцыялістычным будаўніцтве вёскі надзвычайна нізкая. У лепшым выпадку—комсамольцы былі ня дрэннымі ўдарнікамі ў выкананьні конкрэтных работ (пасеў, уборка, сілос), але ад іх патрабуецца ня толькі гэта.

Задача ячэйкі заключаецца ў тым, каб яна была ініцыятарам, застрэльшчыкам ва ўсякім мерапрыемстве, каб яна змагла на конкрэтнай справе організаваць масы моладзі, стаць на чале іх.

У гэтым—галоўнае. Але менавіта гэтага ў большасьці выпадкаў якраз яшчэ не хапае ў рабоце вясковай ячэйкі. **Таму барацьба за павышэньне ўдзельнае вагі вясковай ячэйкі, за масавасьць у яе рабоце павінна быць стрыжнем райконфэрэнцыі да падрыхтоўкі к зьезду.**

У гэтым павінен дапамагчы вёсцы і горад. За апошні час увайшла ў сыстэму пасылка брыгад з гораду ў вёску. Брыгады аказваюць не малую дапамогу. Але вельмі часта яны затушоўваюць мясцовую ячэйку, не дапамагаюць ячэйцы стаць організатарам моладзі, а падмяняюць яе і працуюць за яе.

Нярэдкі і такія выпадкі, калі прыходзіць група комсамольцаў з мястэчка альбо заводу для правядзеньня тае ці іншае работы ў колгасе, наладжвае мітынг, умаўляецца аб рабоце, выконвае гэтую работу і ўходзіць. Асабліва гэта часта было з сілосаваньнем. Такая вузкая практычная дапамога ня прыносіць патрэбнай карысьці.

Гэта па сутнасьці—праяўленьне дзялацтва, якому трэба абвясьціць рашучую барацьбу. **Навучыць вясковую ячэйку стаць організатарам мас моладзі, павысіць яе ўдзельную вагу—вось задачы сёньняшняга дня.**

Організацыйна замацоўваць узрастаючую актыўнасьць працоўнай моладзі

Баявой задачай падрыхтоўкі да зьезду павінен стаць ахоп рабочай моладзі комсамолам. Соцыялістычнае спаборніцтва, якое ўсё шырэй і шырэй разгортваецца, організацыя сустрэчнага прамфінпляну, кантрактацыя,—усё гэта гаворыць аб агромністым росьце палітычнай самасьвядомасьці рабочае клясы наогул і рабочае моладзі ў прыватнасьці.

Аднак, рост палітычнай актыўнасьці організацыйна замацоўваецца вельмі слаба. Мы маем ня мала такіх выпадкаў, калі рабочыя, хлопец альбо дзяўчына, зьяўляюцца добрымі ўдарнікамі, яны законтрактаваліся да канца пяцігодкі і г. д., а знаходзяцца па-за шэрагамі комсамолу. Яны не ўступаюць у комсамол не таму, што зьяўляюцца яго праціўнікамі,—не. Яны—за комсамол. Але з імі не вядзецца работа, **яны слаба адчуваюць організуючую ролю комсамолу, яны часта не ўсьведамляюць розьніцы між ударнікам беспартыйным і ўдарнікам комсамольцам.**

Пытаньне тут упіраецца і ў масавую работу комсамолу.

Ад комсамольскай ячэйкі патрабуецца ня толькі, каб усе комсамольцы былі прыкладнымі ўдарнікамі, але каб ячэйка была організатарам моладзі, каб моладзь бачыла ня толькі ўдарнікаў-комсамольцаў, але адчувала-б іх організуючую ролю.

Задача павышэньня організуючай ролі ячэйкі, замацаваньня росту палітычнай актыўнасьці працоўнай моладзі—важнейшая задача ў працы па падрыхтоўцы да зьезду.

Організаваць масавы абмен вопытам

Падрыхтоўка да зьезду і правядзеньне раённых конфэрэнцый павінны стаць масавай самаправеркай комсамольскай організацыі, масавай перадачай вопыту работы і зборам прапаноў па паляпшэньню работы комсамолу. Некаторыя ячэйкі ўжо пачын зрабілі.

Друкуемыя рапарты аб гэтым гавораць. Неабходна ўсім ячэйкам і ўсім раёнам гэты пачын падхапіць.

Трэба, каб кожная ячэйка, кожны раён давалі справаздачы праз друк аб сваёй рабоце. Але для саюзу каштоўна ведаць ня толькі аб тым, што зрабіла ячэйка, але і бачыць як яно было зроблена.

Рапарты ячэек, з указаньнем як праводзілася тая ці іншая работа, дапамогуць організаваць масавы абмен вопытам.

Але гэтага мала.

Асноўнае,—каб ячэйку ўбачылі масы рабочай, батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі, трэба каб яны сказалі сваё слова аб дзейнасьці комсамолу.

Не павінна быць ніводнага райкому, які-б не організаваў конфэрэнцыі моладзі з дакладам аб дзейнасьці комсамольскай організацыі данага раёну, не павінна быць ніводнай ячэйкі, якая-б не зрабіла справаздачы аб сваёй рабоце перад беспартыйнай працоўнай моладзьдзю.

М. РЫНДЗІЧ

Усім організацыям ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ паведамляе, што 7-X 1930 году склікаецца чарговы пленум ЦК з наступным парадкам дня:

1. Ліквідацыя акруг і чарговыя задачы рай-організацыі.
2. Аб скліканьні 10-га зьезду ЛКСМБ і правядзеньні райконфэрэнцый.
3. Організацыйныя пытаньні.

На пленум ЦК выклікаюцца члены і кандыдаты Цэнтральнага Камітэту, Цэнтр. рэв. камісіі і ўсе сэкратары ГРК і РК.

Пленум адчыняецца а 6-й гадзіне ў залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

Дзесяць эшалёнаў бульбы пролетарам Маскв

МЫ АБАВЯЗАНЫ

мобілізаваць увесь комсамольскі энтузіязм даць Маскве дзесяць эшалёнаў бульбы

МЫ ВЫКАНАЕМ — мобілізаваўшы ўсе сілы, шырока разгарнуўшы ў працы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, дапамагаючы саў сам, колгасам і адзінаЛічным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам выкапаць бульбу і дастаўіць яе на месца пагруз

Дзесяць эшалёнаў бульбы, адпраўленыя ЛКСМБ, будуць лепшым падарункам свайму X зьезду і IX зьезду УсеЛКСМ

Да 20-га 10 эшалёнаў павінны быць у Маскве

Па заданьню ўраду на Беларусі патрэбна загатовіць 6.063.000 тон бульбы. З гэтае колькасьці комсамол Беларусі, па выкліку Маскоўскага камітэту УсеЛКСМ, узяў на сябе абавязак выключна сваімі сіламі загатовіць і адгрузіць да 20 кастрычніка 10 эшалёнаў бульбы,— 8.500.000 кілёграм.

ЦК ЛКСМБ, у сваёй пастанове ад 28 верасьня па пытаньню аб удзеле комсамолу ў бульбазагатоўках, адзначыў, што:—„**Комсамольская організацыя не пераключыла сваю работу на баявыя тэмпы па дапамозе загатоўчым організацыям у выкананьні пляна ў бульбазагатовак. Гэткае становішча высоўвае перад комсамолам Беларусі адказную задачу:—накіраваць увесь комсамольскі энтузіязм на дапамогу партыйным і загатоўчым організацыям**“.

ЦК абвязаў комсамольскія організацыі правесьці шырокую масавую працу сярод колгасьнікаў, рабочых савгасаў і адзіналічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб політычнай важнасьці сваечасовага выкананьня пляну бульбазагатовак.

Матар'ялы з месц аб ходзе бульбазагатовак, якімі мы распалагаем, сьведчаць аб тым, што загатоўчыя органы і большасьць комсамольскіх організацый на мясцох не ўзялі патрэбных тэмпаў у працы, з-за гэтага верасьнёўскі плян бульбазагатовак **выканан толькі на 85 проц.**

Такі нізкі процант выклікае трывогу, бо верасень і кастрычнік месяцы зьяўляюцца самымі спрыяючымі **і рашаючымі для бульбазагатовак.**

З прычыны таго, што масавая праца сярод колгасьнікаў і адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і праца па мобілізацыі шырокіх мас комсамольцаў разгорнута зусім слаба, а гэта ў сваю чаргу ўскладняецца недахопам рабочых рук, а таксама і тым, што па шэрагу месц цьвёрдыя лічбы здачы бульбы не даведзены да кулацкіх двароў, ствараецца яўная пагроза зрыву пляну загатоўкі бульбы.

Патрэбна рашуча папярэдзіць, што пастанова ЦК аб тым, каб „раённыя гарадзкія камітэты і ячэйкі ЛКСМБ правялі мобілізацыю комсамольцаў для дапамогі ў капаньні бульбы ў савгасах і колгасах, організаваўшы гэтую работу на грунце соцспаборніцтва і ўдарніцтва“, большасьцю раённых камітэтаў і ячэек рэалізуецца недапушчальна павольна.

Такое становішча ставіць пад пагрозу зрыву выкананьне ўзятых на сябе комсамолам абавязацельстваў загатовіць і адгрузіць 10 эшалёнаў бульбы для Масквы. Важнасьць задачы патрабуе ад камітэтаў і ячэек тэрмінова мобілізаваць усе сілы і скарыстаць усе магчымасьці для хутчэйшага выкананьня ўзятых абавязкаў.

ЛКСМБ павінен яшчэ раз давесьці, што ён сапраўды зьяўляецца „ўдарнай групай, якая ва ўсякай рабоце аказвае сваю дапамогу, праяўляе сваю ініцыятыву і пачын“ (Ленін).

Камітэты і ячэйкі комсамолу абавязаны мобілізавацца на дапамогу колгасам, саўгасам, адзінаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам у капаньні бульбы і дастаўцы яе на месца пагрузкі, шырака разгарнуўшы працу па збору тары.

Мэтодам соцспаборніцтва паставіць гэту работу на рэйкі высокіх ударных тэмпаў.

Патрэбна організаваць скразныя раённыя і комсамольскія брыгады, разьбіўшы іх дзейнасьць па паасобных вучастках—процэсам работы па бульбазагатоўках, пачынаючы ад капаньня і канчаючы пагрузкай у вагоны.

Грамадзкі буксір тут асабліва павінен адыграць сваю ролю ў якасьці сродкаў падцягваньня адстаючых вучасткаў.

Справа бульбазагатовак патрабуе ад партыйных ячэек і комсамольскіх колектываў чыгуначных вузлоў максымальнай паваротнасьці і хуткай і правільнай устаноўкі сваіх сіл для правільнай організацыі і прасоўваньня эшалёну.

Трэба выжыць закаранеласьць, рутыну, расхлябанасьць, якія шмат дзе характарызуюць дзейнасьць чыгуначных і комсамольскіх колектываў.

Толькі пры ўмове, калі ўсе гэтыя задачы будуць ажыцьцяўляцца хутка і па-бальшавіцку мы зможам рапартаваць X зьезду ЛКСМБ аб перамозе на гэтым важнейшым фронце.

Пастанова Сэкратарыяту ЦК КП(б)Б аб організацыі адпраўкі ЛКСМБ у Маскву 10 эшалёнаў

Прыняць да ведама паведамленьне таварыша Палякова аб тым, што комсамол Беларусі, па выкліку Маскоўскама Абкому УсеЛКСМ, узяў на сябе абавязак організаваць і адправіць у Маскву 10 эшалёнаў бульбы, што складае 8.500.000 кілёграм.

Даручыць РК КП(б)Б аказваць комсамолу садзейнічаньне ў гэтым.

Прапанаваць упаўнаважанаму НКШляху забясьпечыць бесьперабойную адпраўку комсамольскіх эшалёнаў.

Усім упаўнаважаным і брыгадзірам ЦК ЛКСМБ па організацыі эшалёнаў з бульбай

Прапаную, на працягу організацыі і да самай адпраўкі эшалёнаў бульбы ў Маскву, інформаваць ЦК ЛКСМБ і „Чырвоную Зьмену“ па тэлефону і тэлеграфу аб ходзе работы па загатоўцы і адпраўцы эшалёнаў. Першая зводка павінна быць здана 6 кастрычніка, рэшта праз кожныя тры дні.

Упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па організацыі і адпраўцы эша ёнаў РУДНІЦКІ.

Комсамолія ўзялася—адчуваецца зрух

— Комсамол з усім уласьцівым яму энтузіязмам узяўся за забясьпечаньне пролетарскіх цэнтраў бульбай шляхам організацыі комсамольскіх эшалёнаў.

Ва ўсіх раёнах, якія павінны загатаўляць бульбу для Масквы, працуюць комсамольцы па адгрузцы і адпраўцы комсамольскіх эшалёнаў у Маскву.

— Комсамолія ўзялася, і ўжо адчуваецца зрух у гэтай справе,—гаворыць тав. Прэабражэнскі, адказны за бульбазагатоўкі ў Наркомгандлі.

Наркомгандаль з свайго боку, у сувязку з організацыяй комсамольскіх эшалёнаў, даў у нізавыя організацыі суровую дырэктыву аб дапамозе комсамольцам у іх працы.

— Самы галоўны недахоп у працы па падрыхтоўцы бульбы—гэта недахоп рабочых рук.

За верасень м-ц плян бульбазагатовак быў выканан на 85 проц. за 4 **дні кастрычніка ўжо выканана 100 проц. верасьнёўскага пляну.** Аднак у шэрагу раёнаў пазіраецца і зараз звычайная павольнасьць. Сьмілаўскі р-н, як раён больш забясьпечаны бульбай, павінен быў даць па пляну 3000 тон бульбы, але зараз плян па вывазцы ня выканан нават на 10 процантаў.

Комсамол у гэтым напрамку бязьдзейнічае

ЦСПСБ абавязаў профэсыйную організацыю мобілізаваць па магчымасьці больш рабочых рук для забясьпечаньня капаньня бульбы.

СНК з свайго боку вынес пастанову аб прэміяваньні капальнікаў бульбы.

— Зараз,—гаворыць тав. **Прэабражэнскі**,—у зьвязку з тым, што газэты і комсамол удзяляе значную ўвагу бульбазагатоўкам, у гэтай справе адчуваецца значны зрух.

Дзялягі з Саюзтрансу адбаярваюцца

Затое ў **Саюзтрансе** ніякіх зьмен, ніякага зруху няма. **Старшыня Саюзтрансу**, калі ў яго запыталіся, што зроблена гэтай організацыяй у галіне дапамогі бульбазагатоўкам, пачаў гаварыць аб тым, што організацыя маладая, мае толькі 8-10 проц. усёй перавознай сілы БССР, а таму ня можа ўдзяліць належнай увагі бульбазагатоўкам, да таго-ж справа бульбы—ня іх справа.

Тэрміновая дырэктыва з **Масквы** аб дапамозе ў бульбазагатоўках, атрыманая 27-га верасьня, да сёньняшняга дня ляжыць падшытай да спраў у **С юзтрансе** і не пасылаецца ў раённыя канторы, якія шмат чым павінны дапамагчы.

Партыйная, комсамольская ячэйкі і мясцком **Менскай** канторы Саюзтрансу нічога конкрэтнага не зрабілі, каб падрыхтавацца як належыць да бульбазагатовак і перавозак бульбы па сваёй мясцовасьці.

— Мы зробім усё магчымае, каб дапамагчы ў справе бульбазагатовак,—абяцае старшыня **Саюзтрансу**.—Мы сёньня-ж адправім дырэктыву атрыманую з **Масквы** ў раёны.

Мы чамусьці сумняваемся ў тым, што гэтыя словы будуць сёньня-ж ператвораны ў жыцьцё. Каб гэтыя абяцаньні, тав. старшыня, не засталіся толькі пустымі словамі?

Ц.

Суцэльныя чырвоныя абозы з хлебам і бульбай

У дзень сьвяткаваньня Усесаюзнага дня ўдарніка колгасамі і адзінаасобнымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі БССР былі організаваны чырвоныя абозы з хлебам і з бульбай.

Так, чырвоныя абозы Горацкага раёну здалі 930 цэнтнэраў збожжа і 1980 цэнтнэраў бульбы.

У Чавускім раёне чырвоныя абозы дасягнулі каля 1000 падвод. Здана імі 30 тон збожжа і 264 тоны бульбы.

У Гарадоцкім раёне чырвонымі абозамі ў дзень ўдарніка здана 779 тон збожжа і 1124 тон бульбы.

У Межынскім р-не 30-цю чырвонымі абозамі здана 107 тон збожжа.

У Журавіцкім раёне чырвонымі абозамі здана 49 тон збожжа і 150 тон бульбы.

Колгасамі, бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі Чэрыкаўскага раёну здадзена ў дзень ударніка 178 цэнтнэраў збожжа і 66 тон бульбы.

Па Рэчыцкім раёне здана 48 тон збожжа і 50 тон бульбы.

У Ветрынскім раёне, па даным з 5 загатоўчых пунктаў, было організована 9 чырвоных абозаў з колькасьцю 800 падвод, якімі было здана 15 тон збожжа і 50 тон бульбы. У выніку організацыі чырвоных абозаў гадовы плян па збожжу выканан на 84 проц. і па бульбе на 74 проц.

Уключыліся ў працу

3 кастрычніка, на пашыра[…] паседжаньні бюро Аршанскага ЛКСМБ і ў прысутнасьці сэкр[…] роў Мсьціслаўскага, Дрыбінск[…] Капыльскага, Крупскага, Кохан[…] скага і Талочынскага райко[…] ЛКСМБ, была абгаворана пастан[…] ЦК аб організацыі і адпраўц[…] Маскву з Аршанскага вузла […] вагонаў. Бюро пастанавіла:

Загатоўку і адпраўку бул[…] правесьці сіламі комсамольца[…] піонэраў з прыцягненьнем бес[…] тыйнай працоўнай моладзі, орг[…] зуючы падвозку бульбы да чыгу[…] праз чырвоныя абозы.

Загатоўка і адпраўка бульбы асобных раёнах праводзіцца наст[…] ным чынам:

Мсьціслаўскі раён загатаўляе вагонаў, з якіх 50 адпраўляецц[…] Воршу 13 кастрычніка і аста[…] 20—15 кастрычніка.

Капыльскі раён загатаўляе вагонаў і адпраўляе ў Воршу 1[…] кастрычніка, Кохана ўскі р-н загат[…] ляе 5 вагонаў і адпраўляе 15 […]стрычніка. Крупскі раён загат[…] ляе 35 вагонаў, Талочынскі—5 […]гонаў і Дрыбінскі — 10 ваго[…] якія адпраўляюць у Воршу 18 […]стрычніка.

Для дапамогі раёнам у загато[…] бульбы з Воршы кінута 20 ак[…] вістых. У раёнах правядзеньня загатоўкі бульбы організоўваю[…] ўдарныя брыгады па капан[…] бульбы.

Бюро абавязала чыгуначны […]лектыў МББ чыгункі ячэек […] станцыі Крупкі, Талочын, Кохан[…] Копыль, Цёмны Лес і Ходасы пры[…] рашучыя захады да забясьпечан[…] эшалёнаў паравозамі і вагонамі сваечасовай перакідкі апошніх ст. пагрузкі бульбы. Чыгуначн[…] колектыву КСМ да 10 кастрыч[…] даручана скласьці скразныя ко[…]мольскія ўдарныя брыгады (як […]равозныя, так і кандукторскія), […] будуць весьці эшалёны ад ст[…] Воршы да Масквы.

Прыступілі да конкрэтнай работы

Організоўваюцца скразныя брыгады і пасты

МАГІЛЕЎ, 3. Комсамольская організацыя Магілеўскага р[…]ёну адна з першых організацый КСМ падхапіла пастано[…] ЦК ЛКСМБ аб організацыі і адпраўцы ў Маскву чырвон[…] эшалёнаў. На бюро РК ЛКСМБ былі прапрацаваны спэцыяльныя мерапрыемствы па організацыі з кожнага раёну адн[…] чырвонага эшалёну ў колькасьці 30 вагонаў.

Для організацыі эшалёну ў вёскі накіраваны 40 акты[…]стых. РК ЛКСМБ узяў на сябе абавязак даць для капан[…] бульбы 2000 чалавек-дзён.

Каб пазьбегчы прастояў вагонаў пагрузка будзе ўтвор[…] на працягу аднаго дня.

Для хутчэйшай прыёмкі бульбы ад чырвоных абоз[…] наогул ад здатчыкаў мобілізована 50 чалавек, а таксама ў[…] вагі гораду. Пачаўся збор мяхоў. Колектыў чыгункі органі[…]ваў 4 пасты на мясцох пагрузкі і адпраўкі вагонаў.

Пры РК оуганізаваны штаб з Магілеўскага, Быхаўскаг[…] Лупалаўскага раёнаў для організацыі і адпраўкі з гэтых […]ёнаў 100 вагонаў бульбы. У Лупалаўскі раён на дапамогу […]нуты актыў з г. Магілева.

Чыгуначныя ячэйкі ўжо абгаварылі пытаньне аб орга[…]зацыі скразных брыгад для абслугоўваньня эшалёнаў.

Па лініі Магілеўскага РК КП(б)Б дадзены дырэкты[…] ўсім загатоўчым організацыям аб аказаньні ўсямернага […] дзейнічаньня і дапамогі комсамольскім організацыям у п[…]рыхтоўцы бульбы. Даны паказаньні і колектывам КП(б)Б […]гункі Расмасдору і вясковым ячэйкам,

Х. Б.

На дапамогу колгасам

Сёньня №-кі ўдарны полк разьбіўшыся на 4 удар[…] брыгады накіроўваецца ў чатыры колгасы для дапамо[…] правядзеньні ўборкі бульбы.

Дапаможам сваечасова ўбраць ураджай і прав[…] асеньнюю сяўбу—так заявілі чырвонаармейцы.

ПРОТЧАНКА.



дзесятаму ўсебеларускаму

АДЧЫНЯЕМ ПРАДЗЬЕЗДАЎСКУЮ ТРЫБУНУ

Праз паўтары месяцы з усіх куткоў Беларусі зьбяруцца комсамольцы на X зьезд ЛКСМБ для таго, каб абмеркаваць становішча работы і вызначыць далейшыя шляхі ўдзелу організацыі ў выраашэньні чарговых задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Этап пройдзены комсамолам ад IX зьезду характэрны вялікімі зрухамі ў справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пролетарыят БССР у цесным саюзе з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу за гэты пэрыод дабіўся вялікіх посьпехаў у справе індустрыялізацыі БССР, зрабіўшы вялікі крок уперад па ператварэньню аграрна адсталай Беларусі ў краіну аграрна-індустрыяльную.

У простай залежнасьці ад гэтых посьпехаў зьяўляюцца тыя вагромістыя соцыяльна-экономічныя зрухі у вёсцы, якія адбыліся на аснове ўпартай работы па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і ажыцьцяўленьню лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі.

Мінулыя гады адзначаны жорсткімі клясавымі баямі ўнутры краіны, якія з посьпехам праводзіліся пролетарыятамі, які ўпарта выкарчоўваў і выкарчоўвае рэшткі супраціўляючыхся пераможнаму соцыялістычнаму наступу—капіталістычных элемэнтаў.

Гэты час для комсамолу Беларусі характэрны вядомай перабудовай сваіх шэрагаў у адпаведнасьці з запатрабаваньнямі рэконструкцыйнага пэрыоду і разгортваньнем барацьбы з опортунізмамі, „левымі“ загібамі і галоўным чынам правым ухілам, які ва ўмовах Беларусі меў асабліва выразную праяву ў выглядзе прышчэпаўшчыны.

Гэты пэрыод адзначаецца асабліва абвастронай клясавай барацьбой на ідэолёгічным фронце, барацьбой за насычаньне пролетарскім зьместам нацыянальна-культурнага будаўніцтва, супроць спроб і адчыненых атак нацыянал-шовіністычных і нацыянал - дэмократычных элемэнтаў насыціць чуждым пролетарыяту зьместам культурнае будаўніцтва БССР.

У такіх абставінах у пэрыод ад IX да X зьезду рос клясава гартаваўся ЛКСМБ.

Мы знаходзімся зараз напярэдадні 3-га году пяцігодкі. Вялізарныя задачы соцыялістычнага будаўніцтва стаяць перад краінай як у галіне прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, так і ў справе будаўніцтва нацыянальнай пролетарскай культуры.

Таму збор, абагульваньне вопыту праробленай работы да X зьезду ЛКСМБ зьяўляецца абсолютна неабходнай умовай для пасьпяховага разгортваньня далейшай барацьбы за генэральную лінію партыі.

Кожны камітэт, ячэйка, кожны комсомолец зьяўляюцца адказнымі за становішча і работу ўсяго Саюзу. Таму задача організацыі **масавай самаправеркі з найбольшым сапраўдным прыцягненьнем мас да гэтай справы** зьяўляецца парукай пасьпяховасьці разгортваньня падрыхтоўкі да зьезду.

З мэтай практычнай рэалізацыі задачы па прыцягненьню мас да непасрэднага абгаварэньня работы саюзу „Чырвоная Зьмена“ організуе абгаварэньне на сваіх старонках усіх прадзьездаўскіх пытаньняў.

„Чырвоная Зьмена“ з сёньнешняга дня будзе сыстэматычна выдаваць прадзьездаўскую старонку абмену вопытам—„скарбонка вопыту“.

У зьвязку з гэтым, „Чырвоная Зьмена“ высоўвае на абгаварэньне організацыі наступную групу пытаньняў.

1. Вопыт работы і шляхі далейшага ажыцьцяўленьня задачы барацьбы комсамолу за прамфінплян, за бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі, роля і месца ў гэтым КСМ.

2. Барацьба комсамолу за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі, за суцэльную колектывізацыю і на базе яе ліквідацыю кулацтва, як клясы. Работа па організацыйнаму замацаваньню колгасаў. Удзельная вага комсамольскай ячэйкі ў гаспадарча - культурнай дзейнасьці савгасаў і колгасаў. Як улучаецца выкананьне гаспадарчых задач са справай організацыі прыліву і стварэньнем новых колгасаў, работа комсамольцаў колгасьнікаў і ячэек з адзінаасобнікамі—беднякамі і серадняками. Пытаньні быту. Становішча работы і прапановы, як лепш ажыцьцявіць задачы жывёлагадоўлі—сьвінагадоўля, сілосаваньне, якія перашкоды маюцца па шляху ўдзелу ў гэтым комсамолу і як гэтыя перашкоды зьнішчыць.

3. Удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве. Пытаньні ўсеобуча, ліквідацыі няпісьменнасьці, пытаньні літаратуры. Клясавая пільнасьць комсамолу ў барацьбе з варожымі плынямі на культурным фронце. Пытаньне інтэрнацыянальнага выхаваньня, барацьба з шовінізмамі і ў першую галаву з вялікадзяржаўным, барацьба з беларускім нацыянал-дэмократызмам.

4. Унутрысаюзныя пытаньні—ідэёва-політычнае выхаваньне мас комсамольцаў, рост організацыі, яго якасьць, пытаньне выхаваньня актыву, становішча формы і мэтады кіраўніцтва. Становішча парткіраўніцтва, работа піонэрорганізацыі і кіраўніцтва комсамолу.

5. Пытаньне падрыхтоўкі кадраў—тэхнічных, культурных. Барацьба за ФЗВ, за ШКМ, за політэхнізацыю.

Усе гэтыя пытаньні будуць асьвятляцца з пункту погляду, як абагуленьня станоўчага вопыту, так і выяўленьня перашкод з мэтай выжыцьця іх.

Выкаваць гэтую важную і вялікую задачу газэта зможа толькі тады, калі **кожны комсамолец, актывісты і радавік, калі камітэты і ячэйкі** прымуць самы актыўны ўдзел у абгаварэньні прадзьездаўскіх пытаньняў з **трыбуны „Чырвонай Зьмены“, якую мы сёньня адчыняем.**

Ударнікі колгасных палёў

(Ліст комсамольцаў колгасу „Ленінская Беларусь“, Жыткавіцкага раёну)

Абгаварыўшы адозву ЦК УсеКП(б) аб колгасна-вытворчым паходзе і рапарт комсамольцаў і маладых колгасьнікаў колгасу „Расьсьвет Пераможца“, разумеючы вялікую політычную важнасьць своечасовай падрыхтоўкі да IX УсеЛКСМ і X ЛКСМБ зьездаў, мы—комсамольцы колгасу „Ленінская Беларусь“—рапартуем „Чырвонай Зьмене“:

У барацьбе з кулацтвам

Наш колгас „Ленінская Беларусь“ нарадзіўся пасьля вызваленьня Беларусі ад белапалякаў у 1922 годзе **на раскіданых разваліных маёнтку** абшарніка Курачыцкага. Спачатку ў колгас увайшло 18 батрацкіх гаспадарак.

Нам прышлося вытрымаць вялікі націск з боку ашалелага кулацтва, якое імкнулася раскінуць наш колгас. **Кулакі травілі нашыя пасевы, зьбівалі нашых лепшых колгасьнікаў, адбіралі лепшую зямлю, сенажаць.**

У 1924 годзе быў вялікі недарод у колгасе, што зьявілася цяжкім ударам для колгасу „Ленінская Беларусь“. Але дзякуючы палўнасьці моцнага батрацкага ядра колгасьнікаў, сярод якіх было 9 комсамольцаў, колгас не зламыў рук, **а ўпарта ўзяўся за сваё замацаваньне.**

Колгас расьце і мацнее

Некалькі год упартай барацьбы за ўмацаваньне колгасу не прайшлі дарма і далі свае вынікі. Мы выраслі і замацаваліся. Цяпер колгас аб'ядвае 37 батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на плошчы 225 га, нашая колгасная ячэйка КСМ налічвае 15 комсамольцаў.

Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі ў асеньняй кампаніі мінулага году колгас, замест вызначаных для засеву па пляну 30 га, засеяў 39 га.

Была організавана сталоўка з 7-мі комсамольцаў, па прыкладу якіх увесь колгас да 1-га мая перайшоў на агульнае харчаваньне.

У гэтай упартай барацьбе за замацаваньне колгасу і пабудову новага комунальнага быту сапраўды ўдарніцкія вузоры паказаў комсамолец Дуброва Язэп.

У правядзеньні трохмесячніку беларускай пролетарскай і нацменаўскай культуры сіламі комсамольцаў была ліквідавана няпісьменнасьць 11 колгасьнікаў.

Да бальшавіцкага севу былі адрамантаваны ўсе машыны і своечасова складзен вытворчы плян пасеву.

Па ініцыятыве ячэйкі ўвесь колгас абвясьціў сябе ўдарным і выклікаў на соцспаборніцтва колгас „Чырвоны Сьцяг“ Петрыкаўскага раёну. **Толькі дзякуючы соцспаборніцтву і ўдарніцтву вясеньні сеў мы скончылі на пяць дзён раней з перавыкананьнем на 12 проц.** Замест вызначаных па пляну 92,40 га, заселі 105 га. Пад розными культурамі (авёс, бульба, грэчка) мы павялічылі плошчу засеву на 15 проц. Наогул, у гэтым годзе павялічана пасеўная плошча за лік бросавых зямель на 7,5 проц. Сваім энтузіязмам наша ячэйка ўцягнула ў колгас 7 адзінаасобных гаспадарак: 4 батракоў, 1 бядняка і 2 серадняко́ў.

Пасьля севу было загатоўлена 32 кубамэтры торпу.

Пабальшавіцку справіліся з уборкай

Пасьля вясеньняга севу колгас узмоцнена рыхтаваўся да ўборачнай кампаніі. Да 5 чэрвеня быў складзен рабочы плян уборкі. Былі адрамантаваны машыны: жняркі, касілкі, конныя граблі і г. д. 15 ліпеня наш колгас прыступіў да ўборкі жыта. Ня гледзячы на недахоп 800 чалавек рабочай сілы, мы ўбралі ўвесь посеў і сена на плошчы 182 га з выключэньнем 18 га сенажаці, якія зараз будуць закончаны. Адразу пасьля ўборкі прыступілі да абмалоту жыта, абмалаціўшы каля 150 цэнтнэраў на насеньне новым колгасам. Ужо здалі **дзяржаве 20 цэнтнэраў чыстагатунковага жыта і 22 цэнтнэры бульбы для рабочых цэнтраў.**

Разьмеркаваньне ўраджаю яшчэ не праведзена таму, што **колгас пераходзіць у комуну.** У справе правядзеньня ўборкі асабліва ўдарную працу паказалі комсамольцы ўдарнікі **Карнiевіч Я., Галонскі С. і Папок Я.**

Заканчваем асеньні сеў

У маі месяцы ўжо быў падрыхтаваны пар пад жыта, мы расьсеялі рознага мінэральнага ўгнаеньня 250 цэнтнэраў. Заселі 10 га жыта да 25 жніўня. Увесь астатні азімы клін у 35 га зараз засяваем. Правялі лучшэньне 33 га.

Заданьне па сілосу выканаем

Пабудавалі ў трох колгасах 3 сілосныя ямы і заклалі 130 тон сілоснай масы колгасы „Комінтэрн“, „Грэбень“ і „Завет Леніна“.

Адзначаем бюрократычныя адносіны з боку райколгассаюзу і райзямчасткі, якія валакіцілі закладку сілоснай бакшты на працягу 2-х год. Але мы даем абяцаньне **закончыць траншэі і сілосаваньне да 25 верасьня на 100 тон сілосу. Усяго ў нашым колгасе сёлета будзе засілосавана** 140 тон.

Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі ўвесь колгас падпісаўся на 250 р. пазыкі „Пяцігодка—у 4 гады“ і па нашаму прыкладу надпісаўся колгас „Завет Леніна“.

Папок Марфа—лепшая ўдарніца

Пабудова сьвінарніка была закончана 15 жніўня на 100 сьвінаматак, і мы ўжо маем 80 штук сьвіней. Мы лічым неабходным у сваім лісьце адзначыць **лепшую ўдарніцу па сьвінагадоўлі—Папок Марфу.**

Сёлета колгас выгадаваў маладняка (цялят) 33 галавы, якія ўсе закантрактаваны.

Лепшым ударнікам у гэтай справе паказаў сябе Папок М.

Нашы недахопы

Мы адзначаем нашу слабую практычную працу сярод беспартыйнай батрацкай, бядняцка-серадняцкай моладзі. Мы недастаткова займаліся пытаньнем барацьбы за адзінаасобніка, барацьбы за новы быт. Наша ячэйка недастаткова вяла растлумачальную працу ў організацыі батрацкай, бядняцка - серадняцкай моладзі.

Мы абяцаем „Чырвонай Зьмене“ да X зьезду ЛКСМБ канчаткова ліквідаваць усе недахопы і па-бальшавіцку змагацца за колектывізацыю адзінаасобнікаў. За ўцягненьне лепшых маладых батракоў і беднякоў у шэрагі комсамолу.

Абавязваемся

Мы абяцаем засадзіць гэтай восені сад на 250 дрэў. Падрыхтаваць матар'ял на новы будынак для 200 штук жывёлы. Пабудаваць 15 рамачных вульляў і да 15 кастрычніка закантрактаваць увесь азімы пасеў жыта. Бярэм на сябе абавязак павесьці растлумачальную працу сярод колгасьнікаў з такім разьлікам, каб да гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі колгас перайшоў на комунальны статут.

Мы выклікаем усе комсамольскія колгасныя ячэйкі пасьледваць нашаму прыкладу і па-бальшавіцку ўключыцца ў колгасна-вытворчы паход комсамолу.

Па даручэньню агульнага сходу, бюро ячэйкі КСМ колгасу „Ленінская Беларусь“

Я. ГЕЛЬФАНД.
Л. ВУЛЬСКАЯ.
А. КАРНІЕВЧ.

Лепшых ударнікаў заводаў—на дапамогу транспарту!

МАСКВА. ЦК УсеЛКСМ пастанавіў правесьці мобілізацыю 750 комсамольцаў-ударнікаў, сьлесароў і такароў на ўзмацненьне кадраў транспарту.

Па гэтай мобілізацыі Украіна павінна даць 175, Масква і Ленінград па 150, Урал—75, Заўкаўказьзе—50, Паўночны Каўказ—35, Ніжні-Ноўгарад і Заходні край—па 30, Іванаўскі край—25, Беларусь—20 і Крым—10 комсамольцаў.

Усе мобілізуемыя на транспарт комсамольцы пройдуць спэцыяльныя шасьцімесячныя курсы, а потым прыступяць да самастойнай работы ў якасьці машыністых і памочнікаў машыністых на паравозах. Акрамя таго, унутры чыгуначнага транспарту будзе мобілізавана 250 комсамольцаў-ударнікаў, якія таксама пройдуць 6—8 месячныя курсы, пасьля чаго зоймуць пасады адказных станцыйных працаўнікоў.

Да асеньня-зімовых перавозак

ГАЛЕЦКАГА НЕ ДАТЫЧЫЦЦА

справа асеньня-зімовых перавозак, бо ён і яму падобныя кіраўнікі Віцебскай канторы Саюзтрансу, ст. Віцебск—МББ і таварнага двара Гомель—пасажырская—даводзяць да развалу гэтыя прадпрыемствы, п'янствуюць і зрываюць асеньня-зімовыя перавозкі

Патрабуем зьмены абанкроцiўшагася кіраўніцтва!

Мова ганебных фактаў

Комсамольская ячэйка Гомель—пасажырская на таварным двары організавала комсамольскі пост, у абавязак якога ўваходзіць нагляд за сваечасовай разгрузкай і пагрузкай вагонаў, сваечасовай іх падачай і ўборкай да месц пагрузкі і выгрузкі.

На вузьле адсутнічае адзіны адміністрацыйны цэнтр, дзякуючы гэтаму бываюць вялікія прастоі і блытаніна з нагрузкай і выгрузкай вагонаў. Зусім дрэнна скарыстоўваюцца манэўровыя сродкі.

15-га верасьня, 9 пляцформаў, за нумарамі: 225808, 473833, 998645, 410943, 512704, 487945, 873412, 716341 і 86701 па нейкаму галавацапскаму загаду, былі паданы пад выгрузку на месца, дзе ўжо ляжалі выгружаныя дровы. З-за гэтага прышлося пляцформу перастаўляць, і ўрэшце патрачана на кожную пляцформу па 6 гадзін, ня лічачы патрэбнага часу на іх выгрузку.

Прыбыўшыя вагоны несваечасова падаюцца. Напрыклад, вагоны № 493895 і № 787392, якія прыбылі 11-га верасьня а 23 гадзіне, падачы пад выгрузку толькі 12-га верасьня пасьля 13-ай гадзіны. Альбо, напрыклад, такі, яўна шкодзіцкі факт. Пляцформы № 267829 і 127688 нагружаныя стойкамі для Донбасу, адпраўлены па прызначэньню толькі 9-га верасьня, замест 3-га.

Сыстэматычна назіраюцца безадказныя адносіны да выгрузкі пакгаузаў базы Саюзтрансу і Гомельск. ЦРК. Напрыклад, вагон № 298903, нагружаны вапнай, прыбыў для ЦРК 13 верасьня, а выгружан толькі 16-га, прастаяўшы такім чынам па віне гаспадарнікаў ЦРК трое сутак. Вагон № 836389, нагружан сольлю, выгружаўся ГЦРК 50 гадзін. Усё гэта адбываецца ў той час, калі транспарт перажывае вялікі недахоп у паражняку.

Падобныя прыклады можна працягваць бясконца. Толькі за трэцюю дэкаду жніўня па плянавых нагрузках з прычыны не падачы паражняку не нагружана 410 вагонаў.

Вельмі хворае месца ў працы таварнага двара—рабочая сіла. У колектыве грузчыкаў ёсьць вялікая колькасьць пазбаўленцаў, прышоўшых з вёсак і інш. Ня гледзячы на такі рознаколерны склад рабочых, мясцком не праводзіць ніякай выхаваўчай працы. Працдысцыпліна ганебна ўпала, соцспаборніцтва ня мае належнага ўплыву на работу.

Рвацкія настроі пануюць сярод рабочых грузчыкаў і ніхто не дае належнага ім адпору. 16 верасьня кіраўнік арцелі грузчыкаў Грышчака адмовіўся ісьці з арцельлю выгружаць вагон капусты толькі з-за таго, што на гэтай працы малы заработак.

Усе вышэйпаданыя выпадкі мовою фактаў кажуць аб тым, што ў агульным ланцугу асеньня-зімовых перавозак, у працы таварнага двара і некаторых гаспадарчых організацый, якія атрымоўваюць масавыя грузы, ёсьць цэлы шэраг хваробных зьявішчаў, зьнішчэньнем якіх абавязкова павінны заняцца адпаведныя органы.

Кіраўнік ударнага комсамольскага паста У. КАПЦЮГОЎ.

Гомель.

„...Нас гэта ня тычыцца",

а Віцебскія транспартныя прадпрыемствы да асеньніх перавозак не падрыхтаваны

На пытаньне,—як Віцебская кантора Саюзтрансу рыхтуецца да асеньня-зімовых перавозак,—яе шматпаважаны загадчык, тав. Галецкі, адказаў:

—„Гэтым пытаньнем павінен займацца мясцком, а нам да гэтага і справы няма".—Так адказаў тав. Галецкі, які зусім з галавой вашоў у справы п'янкі і бутэлек, якія знойдзены ў яго канторы.

Ня лепш працуе і старшыня мясцкому Бурсак. Асеньня-зімовыя перавозкі яго таксама мала цікавяць. Ні на сходах мясцкому, ні на агульных сходах гэта пытаньне ні аднаго разу не стаяла. Тав. Бурсак зьбірае сяброўскія ўзносы, піша і падшывае паперы і ня больш. Рэшта пытаньняў яго не датычацца.

І гэткая праца адміністрацыі і мясцкому дала свае вынікі. Рабочыя ня ведаюць аб задачах і важнасьці паспяховага праводзеньня асеньня-зімовых перавозак. Грамадзкая думка вакол гэтага пытаньня ня ўзьнята.

Толькі 20 верасьня быў склікан сход, на якім абгаварвалі пытаньне аб адозьве ЦК УсеКП(б). Да 20 верасьня ніхто палец аб палец ня стукнуў па гэтаму пытаньню. 17 верасьня было склікана пасяджэньне мясцкому і ніхто з членаў мясцкому не зьявіўся за выключэньнем аднаго. Усе гэта сьведчыць аб тым, што праца ў Саюзтрансе пастаўлена надзвычайна дрэнна. Гэта організацыя нездольна організаваць сваю працу на справу ўдзелу ў асеньня-зімовых перавозках. Гора-кіраўнікі, што давялі да такога становішча, павінны быць зьняты з працы.

Ня лепш пастаўлена справа з асеньня-зімовымі перавозкамі на чыгуначным вузьле станцыі Віцебск МББ. Адозва ЦК таксама не прапрацавана. Калі на агульным сходзе стаяла аб гэтым пытаньне, сакратар партыйнай ячэйкі Рохман не зьявіўся, як звычайна не зьяўляецца на іншыя сходы.

Ніякай культурнай працы сярод рабочых не вядзецца. Ячэйка, рабочком ні цікавяцца гэтым пытаньнем. Антысэміты паднялі сваю галаву. „Жыдоўская морда, парх" і іншыя „пэрлы" ня зыходзяць з вуснаў рабочага Мануйка і другіх. Аднойчы Мануйка з гэтымі словамі кінуўся зьбіваць рабочага Галадвецкага і ніхто на гэта не рэагаваў і ніякіх захадаў ня прыняў.

Цэлы шэраг прыкладаў сьведчыць аб тым, што такая пастаноўка працы ня можа даць належныя ўдарныя вынікі. Прастоі, безгаспадарнасьць, п'янкі ня спыняюцца, а павялічваюцца. 16-га верасьня пры выгрузцы бульбы грузчык Буланаў прапаваў у п'яным выглядзе і ніхто не зацікавіўся яго працай. 15-га верасьня тры вагоны былі паданы ня туды, куды трэба і рабочыя прастаялі доўгі час бяз працы.

Гэтыя хронолёгічныя даты шкодніцкіх адносін да працы, да справы асеньня-зімовых перавозак і лепшага скарыстаньня транспарту можна працягваць і працягваць бясконца.

Брыгада грузчыкаў, якая была паслана з Менску ў Віцебск з мэтай узяць на буксір транспартныя прадпрыемствы Віцебску, высьветліла яшчэ цэлы шэраг ганебных фактаў безадказных адносін да справы.

Мы патрабуем праверкі кіруючага складу працаўнікоў Саюзтрансу і Віцебскага чыгуначнага вузла з тым каб працаўнікі тыпу Галецкага, Бурсака і ім падобныя былі зьняты з працы і прыцягнуты да суровай адказнасьці з тым, каб адназьнейшая праца асеньня-зімовых перавозак ня была даручана такім п'яніцам і непрабудным дзялягам, якія ня бачаць політычнага сэнсу у гэтай адказнай працы.

Мы чакаем слова адпаведных партыйных і адміністрацыйных органаў.

Брыгада менскіх грузчыкаў:

М. БЕЛАЗОЎСКІ, Г. ТОМСКІ
А. КУЗЬНЕЦ, ПЯТУХОЎСКІ і
РАХЛІС.

Мірная карціна

(Не з Трацьцякоўскай галярэі)



Асаблівыя тлумачэньні не патрэбны...



Тармазы павінны быць зьменены!

Выклікаем курсы Менску

Курсанты рахункаводных курсаў падпісаліся кожны на 10 рублёў, што складае ў агульным 460 руб.

Выклікаем усе курсы гораду Менску пасьледваць нашаму прыкладу і падпісацца па пазыку.

Сушкевіч.

Паведамленьні

Сёньня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ФРК ЛКСМБ склікаецца нарада па пытаньню аб працы кіно „Юны Піонэр". На нараду выклікаюцца сябры ФРБ ДКА, павадыры баз, важатыя фарпостаў, прадстаўнікі ад Гороно.

ФРБ ДКА.

6-га кастрычніка, а 7-й гадз. ўвечары, у памяшканьні пакою павадыра (Энгельса, 28) адбудзецца сход колектыву важатых атрадаў Фрунзэўскага раёну па пытаньню: Рэалізацыя загаду ЦБ ДКО № 2. Яўка важатых атрадаў, фарпостаў і іх памочнікаў абавязкова.

ФРБ ДКА.

Сёньня 5-X а 6 ай гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджэньне прыймовай камісіі Фрунз. РК ЛКСМБ. Яўка сяброў прыймовай камісіі абавязкова.

ФРК ЛКСМБ

Прыймовыя камісіі ФРК ЛКСМБ будуць адбывацца 5, 15, 25, 30 кожнага месяца.

Кляса супроць клясы

Эканамічны крызыс ахапіў Уэльс

ЛЁНДАН, 30. З прычыны эканамічнага крызысу ў паўднёвым Уэльсе (Ангельшчына) зачыняецца шэраг прадпрыемстваў.

Так, зачыніўся буйны сталеліцейны завод Брайтонффэрры і Цынкавы завод Ліэнлі. У Цоўлейсе (паўднёвы Уэльс) з прычыны зачыненьня, якое мае адбыцца гэтымі днямі, прадпрыемстваў фірмы „Геста Нін Энд Болдуіна" на вуліцу выкідаецца 2.500 рабочых.

У Січэн Харборы (Дэргем) зачыняецца адна з буйнейшых каменна-вугальных капальняў лёрда Лэндэндэр. Бяз працы застанецца каля 3.000 вугляконаў.

ЛЁНДАН, 2. Ва Уальсалі (каля Бірмінгама) на каменна-вугальнай капальні Гро... здарыўся выбух, у час якога загінула 14 вуглякопаў. Выбух, як відаць, адбыўся з прычыны зграмаджэньня газаў у шахтах. Гэта трэці буйны няшчасны выпадак за апошнія 4 тыдні ў ангельскай вугальнай прамысловасьці.

Паход на зарплату нямецкіх рабочых

БЭРЛІН, 29. Як ужо паведамлялася, бэрлінскія мэталапрамыслоўцы дабіваюцца 15 проц. звароту заработнай платы рабочымі. Справа не абмяжоўваецца толькі Бэрлінам.

У Саксоніі, Вэстфаліі, Брандэнбурзе, Помэраніі і інш. мясцох прадпрыемцы таксама патрабуюць скарачэньня заработнай платы мэталістым на 16-20 проц. Тыднёвы заработак нямецкіх мэталістых у сучасны момант складае для кваліфікаваных рабочых 68 марак, для некваліфікаваных—49-40 марак, для работніц—29 марак. Аднак, рэальны заработак бэрлінскіх мэталістаў фактычна значна меншы ў выніку адлічэньняў падатку і ўзносаў па соцыяльнаму страхаваньню. Увогуле рэальная заработная плата ва ўмовах бязупыннага росту дарагоўлі складае толькі 68 проц. даваеннай зарплаты кваліфікаваных рабочых.

Адказны рэдактар—Рэдколегія

6-га КАСТРЫЧНІКА АДБУДЗЕЦЦА

конфэрэнцыя ўдарнікаў і рабочае моладзі Фрунзэўскага раёну.

На абвестцы дню:

1. Аб політычна-гаспадарчых задачах 3-га году пяцігодкі;
2. Інформацыя з месц наступных колектываў: „Кастрычнік", „Комунар", ДО Белдзяржбуд, „Беларуска", Нархарч, Першая друкарня і саўгас Лекерта;
3. Інформацыя журэйскай камісіі аб перадачы пераходнага сьцягу.

Модус прадстаўніцтва: адзін з 8-мі чалавек рабочае моладзі. Конфэрэнцыя адбудзецца ў памяшканьні Дому Працасьветы а 6-ай гадз. увечары. Выдача мандатаў—з 4-га па 6 кастрычніка, з 11 да 3 гадз. дня і ад 5 да 7 гадз. увечары. ФРК

БЕЛКООПСАЮЗ

СЕЛЕТА АДКРЫВАЕ ШЭРАГ ШКОЛ

коопэрацыйнага вучнёўства, масавых профэсій, якія выпускаюць спэцыялістых:

1. У галіне абмену і разьмеркаваньня (гандлёвай): загадчыкаў магазынаў, старшых прадаўцоў і загадчыкаў разьмеркавальных баз;
2. У галіне загатоўкі: кваліфікаваных загатоўшчыкаў (прыёмшчыкаў і інструктароў) розных відаў сыравіны і с.-гасп. прадуктаў;
3. У галіне фінансава-рахунковай і плянава-статыстычнай: старшых рахункаводаў, памоцнікаў бухгальтараў і плянавікоў-статыстыкаў
4. У галіне кіно-радыё працы: кіно-радыё механікаў, манцёраў і інструктароў.

Школы гэтыя па асобных гарадох БССР пляну-юцца наступным чынам:

1. У горадзе Бабруйску—рахунковая і плянава-статыстычная школа на базе 7-годкі, на 120 асоб.

2. У гор. Рагачове }
3. У гор. Мазыры } Школы абмену і разьмеркаваньня і загатоўкі—на базе 4-х годкі, на 120 асоб кожная.

4. У гор. Гомелі — школа кіно-радыё на базе 4-х годкі, на 90 асоб.

У школы прымаюцца дзеці рабочых, батракоў, колгасьнікаў, беднякоў і лепшай часткі серадьнякоў і служач. ва ўзросьце:

1. Ад 14 да 16 год—у школы на базе 4-х годкі.
2. „ 15 „ 17 „ „ „ „ „ „ 7-х „

Жадаючыя паступіць павінны зьвярнуцца да раённых спажыўтаварыстваў, якія ведаюць камандыраваньнем вучняў у азначаныя школы.

Прынятыя ў школы будуць забясьпечаны стыпэндыяй у разьмеры зарплаты бронь-вучняў і інтэрнатамі для прыежджых

Заявы разам з патрэбнымі дакумантамі прымаюцца школамі да 15 кастрычніка. Усе іншыя весткі адносна ўмоў і правіл паступленьня маюцца ў райспажыўтаварыствах.

Апроч памянёных школ у хуткім часе адкрываюцца такія-ж школы ў гарадох: Полацак, Магілеў, на якія будзе дадзена разьвёрстка тым райспажыўтаварыствам, якія не атрымалі

СЭКТАР КАДРАЎ БЕЛКООПСАЮЗУ

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна
Галоўлітбел № 500